УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ПАЎЛАЎ УЛАДЗІМІР АНДРЭЕВІЧ

**ПАЭТ, ПРАЗАІК, ПЕРАКЛАДЧЫК**

**25 КАСТРЫЧНІКА 1935 Г. – 31 КАСТРЫЧНІКА 2020 Г.**

**ФОНД № 373**

**ВОПІС № 1**

**[к. 1950-х гг.]–1993**

МІНСК 2020

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 373**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ У.А. ПАЎЛАВА | 1-19 | 1-3 |
| 1.1. | АПОВЕСЦІ, ПАЭМЫ І ІНШ. | 1-11 | 1-2 |
| 1.2. | ПЕРАКЛАДЫ І ІНШ. | 12-23 | 2-3 |

# Прадмова

**Паўлаў Уладзімір Андрэевіч** нарадзіўся 25.10.1935 г. у в. Замошша Слуцкага, цяпер Любанскага раёна Мінскай вобласці. У 1954 г. Уладзімір Андрэевіч скончыў Дарасінскую сярэднюю школу, працаваў літработнікам любанскай раённай газеты "Кліч Радзімы". У тым жа годзе быў прызваны ў Савецкую Армію, служыў да 1957 г. у Маскоўскай ваеннай акрузе ў авіяцыйнай часці механікам па электраабсталяванні самалётаў. У 1957 г. паступіў на аддзяленне журналістыкі БДУ імя Леніна, якое скончыў у 1962 г. Апошнія тры гады навучання ва ўніверсітэце спалучаў з працай у газеце "Чырвоная змена" і на Беларускім радыё. З 1963 г. да 1967 г. – загадваў аддзелам літаратуры і мастацтва, быў адказным сакратаром газеты "Чырвоная змена", з 1967 г. – адказны сакратар кінабюлетэня "На экранах Беларусі", з 1971 г. – літкансультант Саюза пісьменнікаў БССР. З 1972 г. – загадчык рэдакцыі паэзіі, з 1982 г. – рэдакцыі збору твораў і выбраных твораў выдавецтва "Мастацкая літаратура". З 1986 г. – кансультант па пытаннях літаратуры, з 1990 г. – член Рады, намеснік страршыні Саюза пісьменнікаў БССР. Член СП БССР з 1962 г.

Першы верш У.А. Паўлава "Слаўнае лета" быў надрукаваны ў 1954 г. у газеце "Піянер Беларусі". Падборкі вершаў друкаваліся ў часопісах "Бярозка", "Вясёлка", "Маладосць", "Полымя", газетах "Звязда", "Літаратура і мастацтва", "Калгасная праўда" і інш. Аўтар зборнікаў паэзіі: "Узлётная паласа" (1960), "Далягляд" (1964), "Светацень" (1967), "Начная балада" (1971), "Сонца купаецца" (1976), "Каласы радкоў" (1979), "Сляза на вейцы" (1982), "Гадавое кальцо" (1986), "Што было на Беларусі" (1994) і інш.; кніг аповесцяў і апавяданняў: "Годы нашы птушкі" (1970), "Ад агню і мяча" (1973) і інш. Шэраг кніг адрасаваны юным чытачам "Пажарніца"="Тайна бункера № 7" (1968), "Чуж-чужаніца" (1979), "Радзімкі" (1989), "Колькі гусей убачыў Яўсей" (1994), "Хто знае – адгадае" (1997), "Згадка на дабро" (2004) і інш. Пераклаў на беларускую мову раман "Чужая дачка" Я. Фельдэака (1979), "Момант ісціны"="У жніўні сорак чацвёртага" У.В. Багамолава (1984), паасобныя творы рускіх, украінскіх, літоўскіх, грузінскіх, балгарскіх і інш. паэтаў (кніга яго перакладаў "Поціск рукі", 1991).

Паўлаў Уладзімір Андрэевіч памёр 31 кастрычніка 2020 г.

Дакументы Уладзіміра Андрэевіча Паўлава паступалі ў 1990 г. і 1993 г. ад яго самаго. У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі быў складзены вопіс № 1 у колькасці 23 адзінак захоўвання (132 дакументаў) за [к. 1950-х] –1993 гг. Вопіс складаюць "Рукапісы У.А. Паўлава", якія ўключаюць два падраздзелы, справы ў якіх сістэматызаваны па жанрах, а ўнутры – па храналогіі за 1963–1993 гг.

Прадмову склала Г.Б. Багамолава
Вядучы архівіст
20.01.2020

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ФОНД № 373
ВОПІС № 1
[к. 1950-х гг.]–1993

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 16.10.2020
№ 10

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ У.А. ПАЎЛАВА** | | | | |
| | **1.1. АПОВЕСЦІ, ПАЭМЫ І ІНШ.** | | | | |
| 1 | "Сонца ідзе ў зеніт"="Вернасць". Паэма.<br>Чарнавы аўтограф | 1963 | 21 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 2 | "Аднаго часу", "Базар", "Беражыце патроны !", "Гром", "Дзе той дзень, дзе той час...", "Паласа адчужэння", "Усё выплывае з-за голля крывога...", "Чабор і пчала" і інш. Вершы.<br>Аўтограф, чарнавы аўтограф | 1965, 1983-1992 | 40 | 69 | |
| 3 | Вершы, забаўлянкі-пазнаванкі, загадкі і інш. да мяркуемай дзіцячай кніжкі "Калі ласка".<br>Чарнавы аўтограф | 1990-1993 | 26 | 1/160 | |
| | * * * | | | | |
| 4 | "Яжэліха". Аповесць.<br>Чарнавы аўтограф | 1966 | 73 | 1 | |
| 5 | "У кожнага сваё жыццё"="Спелыя травы". Аповесць.<br>Чарнавы аўтограф | 1968 | 154 | 1 | |
| 6 | "Чуж-чужаніца"="Дазор на Сухой мілі". Аповесць.<br>Чарнавы аўтограф | 1977 | 46 | 1 | |
| 7 | "Радзімкі". Аповесць.<br>Чарнавы аўтограф | 1985, 1986 | 33 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 8 | "Бяру свой род...". Аўтабіяграфія да кнігі "Вытокі песні".<br>Чарнавы аўтограф | 1973 | 7 | 1 | |
| | * * * | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 9 | "Між Бугам і Одрай: Польскія нататкі". Успаміны аб паездцы дэлегацыі СП СССР ў Польшчу па запрашэнні Таварыства польска-савецкай дружбы. Чарнавы аўтограф | 1982 | 16 | 1 | |
| 10 | "Адзін выпадак". Успаміны пра апошнюю сустрэчу з К. Крапівой. Чарнавы аўтограф | 1992 | 5 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 11 | І.І. Васільеў. "Адгрымелі паходы"="Рэйды праз агонь". Літаратурны запіс У.А. Паўлава. Чарнавы аўтограф, выразка з газеты | 1965 | 40 | 2 | |
| | **1.2. ПЕРАКЛАДЫ І ІНШ.** | | | | |
| 12 | Я. Фёльдэак. "Чужая дачка". Раман у перакладзе У.А. Паўлава з венгерскай мовы. Аўтограф | 1978 | 122 | 1 | |
| 13 | С.Ж. Жусуеў. "Госць", "Начная размова", "Развітанне", "Сустрэча" і інш. Вершы ў перакладзе У.А. Паўлава з кіргізскай мовы. Аўтограф, чарнавы аўтограф | [к. 1980-х-пач. 1990-х гг.] | 8 | 10 | |
| 14 | А. Скабіаалэ. "Чаму вучыць прымаўка". Мініяцюры для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту ў перакладзе У.А. Паўлава з малдаўскай мовы. Чарнавы аўтограф, аўтарызаваны машынапіс | 1989 | 15 | 1 | |
| 15 | М. Борх. "Два словы пра Дзвіну", М. Гадлеўскі. "Пакажы мне бледны месяц...", М. Ходзька. "Дзесяць карцін з экспедыцыі ў Польшчу 1833 г." Паэмы. Урыўкі ў перакладзе У.А. Паўлава з польскай мовы. Чарнавы аўтограф | 1991 | 3 | 3 | |
| 16 | М.М. Грыбачоў. "Юргін і Макрусаў". Аповесць ў перакладзе У.А. Паўлава з рускай мовы. Чарнавы аўтограф | 1976 | 23 | 1 | |
| 17 | І.І. Васілеўскі. "Я ў маладосці быў віхрысты...", Я.І. Сігачоў. "Паўзямлі да цябе" і інш. Вершы ў перакладзе У.А. Паўлава з рускай мовы. Чарнавы аўтограф, машынапіс | 1990, [к. 1980-х-пач. 1990-х гг.] | 3 | 5 | |
| 18 | Дзіцячыя загадкі, прымаўкі, скорагаворкі і інш. у перакладзе У.А. Паўлава з рускай мовы да мяркуемага зборніка "Зорны карагод". | 1991 | 21 | 1/183 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справаў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Машынапіс | | | | |
| 19 | А. Блізнюк. "Радасць", П.[Я.] Гарэцкі. "Бераг", "Рака майго юнацтва", Б.П. Стэпанюк. "На грані часу", В.Л. Юхімовіч. "На чыгунцы" і інш. Вершы ў перакладзе У.А. Паўлава з украінскай мовы. Чарнавы аўтограф, машынапіс | 1993 | 15 | 25 | |
| | * * * | | | | |
| 20 | Пісьмо У.А. Паўлаву ад А.В. Пысіна | 1965 | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 21 | Я.І. Янішчыц. "Соль шчырасці". Верш, прысвечаны У.А. Паўлаву з прыпіскай паэтэсы. Аўтограф | 1981 | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 22 | Фатаграфіі У.А. Паўлава, індывідуальныя | [к. 1950-х, 1980-я гг.] | 2 | 2 | |
| 23 | К.Н. Куксо. Шарж на У.А. Паўлава. Папера, туш, пяро | 1975 | 1 | 1 | |

У дадзены вопіс унесена 23 (дваццаць тры)
справаў з № 1 па № 23 , 132 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла
2020 г.

Г.Б. Багамолава
______________________

Дакументы прынялі:
заг. аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў

В.І. Бярэйшык
______________________

______________________

"_____"____________20____ г.